Юбілеі. Нацыянальная бібліятэка Беларусі ў верасні адсвяткуе 100-годдзе. Генеральны дырэктар бібліятэкі Аксана Кніжнікава расказала БелТА аб планах да юбілейнай даты. Так, запланавана ўрачыстае гашэнне паштовага блока. У НББ прэзентуюць абноўлены вучэбны дапаможнік «Беларусь — наша Радзіма. Падарунак Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі першакласніку». Запланаваны 15—16 верасня IX Міжнародны кангрэс «Бібліятэка як феномен культуры». На яго палях пройдзе XXVI Агульны сход членаў некамерцыйнага партнёрства «Бібліятэчная асамблея Еўразіі». Падчас святкавання Дня беларускага пісьменства ў Добрушы НББ да свайго 100-годдзя прадставіць выстаўку «Кніжны век». Дапоўніць яе экспазіцыя рэдкіх і каштоўных матэрыялаў, прысвечаных гісторыі і дзеячам Гомельшчыны. Гэтая частка экспазіцыі прымеркавана да 880-годдзя з часу першага згадвання Гомеля. Падрыхтавана перасовачная фотавыстаўка «Нацыянальная бібліятэка Беларусі: учора, сёння, заўтра». Яе экспанаванне плануецца ў краінах СНД. Сумесна з выдавецтвам «Беларусь» вядзецца работа над выпускам альбома «Нацыянальная бібліятэка Беларусі» на беларускай, рускай і англійскай мовах тыражом 1 тыс. экзэмпляраў.